ЛІДСКАЯ ГАЗЕТА
LIDANEWS.BY

# Прачытаем у «Лідскай газеце» і вершы гродзенскіх паэтаў

Стала добрай традыцыяй раз у год запрашаць на пасяджэнні літаратурнага аб'яднання «Суквецце» гасцей з абласнога цэнтра – членаў Гродзенскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Вось і на днях у рамках чарговага пасяджэння «Суквецця» ў раённай бібліятэцы адбылася сустрэча літаратараў Лідчыны з гродзенскімі калегамі па літаратурным цэху. На гэты раз разам са старшынёй Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ Людмілай Кебіч у госці да суквеццеўцаў завіталі празаік Ліна Багданава і паэтэса Кацярына Каламійцава. Госці з Гродна расказалі пра сябе, пра сваю творчасць, азнаёмілі са сваімі кнігамі і творчымі праектамі, зачыталі некаторыя свае творы. Сустрэча, як звычайна, атрымалася цёплай, пазнавальнай, душэўна ўзбагачальнай.

Сярод прысутных на сустрэчы з гродзенскімі пісьменнікамі была і член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, намеснік дырэктара - галоўнага рэдактара па друкаваных СМІ ДУ «Рэдакцыя "ЛідаМедыяКампанія"» Кацярына Серафіновіч. Карыстаючыся выпадкам, Кацярына Адамаўна выказала прапанову раз у паўгода змяшчаць на літаратурнай старонцы «Лідскай газеты» вершы гродзенскіх паэтаў (разам з вершамі іх лідскіх калег па пяры), паколькі лідскае «Суквецце» з мінулага года з'яўляецца ганаровым партнёрам Гродзенскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Прапанова гасцямі з абласнога цэнтра была падтрымана.

Людміла Кебіч азнаёміла прысутных са сваімі новымі кнігамі, якія выйшлі ў 2022-2023 гадах. Сярод іх ёсць і кнігі вершаў для дзяцей і дарослых, і загадкі для дзяцей, і зборнік песень, і аповесці – Людміла Антонаўна працягвае актыўна тварыць у розных жанрах. Кацярына Каламійцава расказала пра сваю сувязь з Лідчынай, сваю паэзію, у якой пераважае філасофская лірыка, таксама азнаёміла са сваімі кнігамі (дарэчы, яна ж з'яўляецца і аўтарам ілюстрацый да іх). Ёсць у паэтэсы і верш да 700-годдзя горада Ліды, які яна зачытала напрыканцы свайго выступлення. Галіна Богдан (літаратурны псеўданім Ліна

Багданава) працуе ў адной з сярэдніх школ Гродна, піша як для дарослых, так і для дзяцей, шмат друкуецца ў розных часопісах. Выйшла ўжо больш за сорак (!) кніг яе прозы. Галіна Анатольеўна расказала пра творчыя праекты, у якіх яна актыўна ўдзельнічае, зачытала пару сваіх кароткіх апавяданняў, а таксама запрасіла лідскіх творцаў да ўдзелу ў сваім новым праекце «Каникулы.by», які закліканы пазнаёміць чытачоў са славутасцямі розных гарадоў Беларусі. «У Лідзе ёсць што паглядзець, – сказала пісьменніца, звяртаючыся да лідскіх літаратараў. – Спадзяюся, што вы станеце маімі суаўтарамі пры стварэнні ў рамках праекта кнігі, прысвечанай вашаму гораду».

**Аляксандр МАЦУЛЕВІЧ,**
**кіраўнік літаб'яднання «Суквецце»**
*«Лідская газета» 27 верасня 2023 года № 75 (13450)*

**На фота:** Ліна Багданава, Людміла Кебіч, Кацярына Каламійцава: гродзенскія літаратары ў Лідзе. Сустрэча з калектывам Лідскага раённага літаб'яднання «Суквецце» прайшла ў фармаце ўтульнай літаратурнай гасцёўні, як заўсёды, у цёплай сяброўскай атмасферы.








220 V










Наш ответ




МОЙ ГОРАД
ЦУДОЎНЫ
ЯК ПЕСН
Горад, дзе чуваць галасы гісторыі
Анастасия Колодяжная
ПАМЯТЬ — главный свидетель
Скарбы Лідчыны 2023
Гарадская паштоўка
Лідчына ўчора, сёння і заўтра


Наследство по собственному желанию


Сузор'е беларускай кнігі
Сузор'е юбіляраў
Пісьменнікі-юбіляры
Кнігі-юбіляры
ЧЁРНЫЙ ЗАМОК ОЛЬШАНСКИЙ
А.К. ТОЛ
БОРИС ВАСИЛЬЕВ


Здоровый образ жизни
Беларуская мова і літаратура


#МЕЧТЫСБЫВАЮТСЯ
Наследство по собственному желанию
в красном
Людміла Кевіч
Мае начныя бліскавіцы

